



THE NEW 52!
DC COMICS
36
SNYDER
CAPULLO
MIKI
PLASCENCIA
BATMAN
ENDGAME
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
БЭТМЭН
#36 (2011)
ПЕРАКЛАД
І АФАРМЛЕННЕ:
КОЗЫРАЎ СЯРГЕЙ
LOOT CRATE VARIANT
LOOTCRATE
exclusive
BONUS!
FREE DIGITAL COPY OF THE FIRST THREE CHAPTERS OF
BATMAN: ARKHAM UNHINGED!
RATED T TEEN • DCCOMICS.COM
EXCLUSIVE PREVIEW
75
www.comicbookresources.com



ГОРШ ЗА ЎСЁ ГЭТА ГУК.
НЕ ВАЖНА, ЧЫМ УСЁ ГЭТА СКОНЧЫЦЦА. НЕ ВАЖНА, ЯК ГЭТА АДБУДЗЕЦЦА. ЦІ БУДЗЕ ГЭТА ХАРВІ З ЯГО ПАДВОЙНЫМІ БОМБАМІ... АДНА ЯДЗЕР-НАЯ, ДРУГАЯ ТЭРМАЯДЗЕР-НАЯ. ЦІ ЛІНКОЛЬН З ЯГО НЭА-КІПЦЮРАМІ.
ЦІ «КАРАЛЕЎСКІ» КРОК-МУТАНТ...
ГЭТА ТОЛЬКІ КАШМАРЫ, БРУС. ПРЫВІДЫ СМЕРЦІ, ВЫКЛІКАНЫЯ **ШТАММАМ «КАССАН-ДРА»** ТАКСІНА СТРАХА КРЭЙНА.
АЛЕ ЯНЫ **ЗДАЮЦЦА** САПРАЎДНЫМІ З-ЗА ГЭТАГА **ГУКА**.
ПАЦЕХА, ШТО СЫХОДЗІЦЬ НЕ АД КРОКА ЦІ ЯШЧЭ КАГО-НЕБУДЗЬ, А АД САМОГА ГОРАДА.
КІМ ТЫ СЯБЕ ЛІЧЫШ?
ЧЫМ ТЫ СЯБЕ ЛІЧЫШ?
ТЫ ПАЧУЕШ ГУК, ЯКО-ГА БАІШСЯ, КАЛІ КАНЕЦ НАДЫХОДЗІЦЬ ПА-САПРАЎДНАМУ...


...ХАЛОДНЫ,
ГУЛКІ СМЕХ.
BATMAN:
ENDGAME PART TWO
WRITER SCOTT SNYDER PENCILLER GREG CAPULLO
INKER DANNY MIKI COLORIST FCO PLASCENCIA LETTERER STEVE WANDS
COVER CAPULLO, MIKI & PLASCENCIA VARIANT COVER BY ANDY KUBERT &
BRAD ANDERSON ASSISTANT EDITOR MATT HUMPHREYS
EDITOR MARK DOYLE BATMAN CREATED BY BOB KANE
СУПЕРМЭН... КЛАРК, ПАЧУЙ МЯНЕ. ЧЫМ БЫ ЁН ТАБЕ НЕ АТРУЦІЎ, ТЫ ПАВІНЕН ЗМАГАЦЦА З ГЭТЫМ! ТЫ ПАВІНЕН ПЕРААДОЛЕЦЬ ГЭТА!
ХІІІІІ... ХІІ... ПРАЛАМІЎ...




ЁН ЗУСІМ НЕ ПАДОБНЫ НА СЯБЕ.
ПРЫВІТАННЕ, БРУС.
ЁН БАЧЫЦЬ ТОЛЬКІ ЦЭЛЬ. НІ НАЙМАЛОГА ВАГАННЯ... АДНА ПАЦЕХА.
ДОБРА, БРУС...
...ЧАС БІЦЦА ЗА СВАЁ ЖЫЦЦЁ.



ЯК ТАБЕ КУЛАКІ, КЛАРК?
КОЖНЫ МОДУЛЬ МАЕ МІКРАСКАПІЧНЫЯ ЧЫРВОНЫЯ СОНЦЫ, САБРАНЫЯ Ў МЁРТВЫХ СОНЕЧНЫХ СІСТЭМАХ ПРЫ САДЗЕЙНІЧАННІ ДОКТАРА РЭЯ ПАЛМЕРА.
Я КЛІЧУ ІХ СВАІМІ ЧЫРВОНЫМІ ГІГАНТАМІ.
ЗАРАЗ ТЫ Ў МЯНЕ ПАТАНЬЧЫШ...
ХЕХ... ЧЫРВОНЫЯ ГІГАНТЫ.
...НАВАТ КАЛІ МНЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА ВЫБІЦЬ З ЦЯБЕ ГЭТУ ЧАРТАЎНЮ!



ТАКІМ ЧЫНАМ, БРУССС. ХТО ПЕРАМОЖА Ў БОЙКЕ? БЭТМЭН...
...ЦІ СУПЕРМЭН?! ХАХАХА!
ДОБРАЯ СПРОБА, АЛЕ ГЭТЫ КАСЦЮМ АБАРОНЕНЫ ПЛАЗМЕНЫМІ ШЧЫТАМІ, КАБ АДБІВАЦЬ **ЦЕПЛАВЫ** ЗРОК.
І ЦЕПЛАЎСТОЙЛІВЫ, КАБ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ТВАЙМУ **ЛЕДЗЯНОМУ** ДЫХАННЮ... А КАЛІ ТЫ ПАДЫЙДЗЕШ ДА МЯНЕ БЛІЗКА, КУЛАКІ ЗРОБЯЦЬ СВАЮ СПРАВУ.
ТАМУ ПРАЦЯГВАЙ, КЛАРК. ПАКАЖЫ СВОЙ ЛЕПШЫ СТРЭЛ.


БА... БА... БА-БААХ.
ГЛУПА, БРУС. ТЫ ЗАБЫЎ...
...КАСЦЮМ БЫЎ СТВОРАНЫ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З СУПЕРМЭНАМ.
АЛЕ Ў СУПЕРМЭНА ЁСЦЬ МЕЖЫ, ЯКІЯ ЁН НІКОЛІ НЕ ПЕРАСЯЧЭ. А ТОЕ, У ШТО ГЭТЫ ЯД ЯГО ПЕРАТВАРЫЎ...


...КАЛІ ЁН ХОЧА ЗАБІЦЬ ЦЯБЕ...
...ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, НА ЗЯМЛІ НЯМА НІЧОГА, ШТО МАГЛО Б СПЫНІЦЬ ЯГО.
ХІХІХІІІ... УВЕРХ... УВЕРХ... І НАПЕЕЕЕЕЕ-РАД!


ДЗЕЕЕЕ ЖА ТЫ, БРУУУС?
КЛАРК! ПАЧУЙ МЯНЕ!
КЛАРК! НЕ РАБІ ГЭТАГА... НЕ...
ХІІХІІ... ВОСЬ ТЫ ДЗЕЕЕЕ!
КЛАРК, ПРАШУ! ГЭТА НЕ ТЫ! ГЭТА **ЁН**! І ЁН...
ХІІХІІ...
ЁН КАЖА: «МАЛІСССЬ»



PTT!
УХ!
ГЭТА СІНТЭТЫЧНАЯ ГУМА НА АСНО-ВЕ БУТАДЫЕНА, ПАЛІМЕР, ЗМЕШАНЫ З РАДЫЯКТЫЎНЫМ КРЫПТОНСКІМ ПЫЛАМ.
АЛЬФРЭД КЛІЧА ЯЕ КРЫПТАНЫТАВАЙ ГУМАЙ.
Я ЗАХОЎВАЮ ПІЛЮЛЮ Ў ШЛЕМЕ КАСЦЮМА.
ХТО ПЕРАМОЖЦА Ў БІТВЕ? АДКАЗ ЗАЎСЁДЫ АДЗІН І ТОЙ ЖА.
НІХТО.


ТАКСІН У ЛІГЕ СПРАВЯДЛІВАСЦІ – ГЭТА ТОЛЬКІ ЗГУБНАЯ ВЕРСІЯ АРЫГІНАЛА. ЯГО ПАТАГЕНЫ СПЕЦЫЯЛІЗУЮЦЦА НА КОЖНЫМ ЧАЛЬЦУ.
ДЛЯ ВІКА ЁСЦЬ ІЗАЛЯВАНЫЯ МІКРОБЫ, З-ЗА ЧАГО ЦЯЖКА ЗАБІЦЬ ВІРУС ЗАРАДАМ. ДЛЯ БАРЫ – НАМАГНІЧАНАЕ ВАЛАКНО...
ЁН УНІКАЛЬНЫМ ЧЫНАМ ЦАЛКАМ НЕЙТРАЛІЗАВАЎ КОЖНАГА.
ЁН **ЗАПЛАНІРАВАЎ** ГЭТА.
АЛЕ ЯНЫ КУДЫСЬЦІ НАКІРОЎВАЮЦЦА, ВЫ ЗГОДНЫ?
ЯНЫ КУДЫСЬЦІ НАКІРОЎВАЮЦЦА. ЯНЫ Ў АРГУСЕ. ШТАБ-КВАТЭРА, ДЗЕ ІХ ЛЯЧЫЛІ КУІНАЛОНАМ, ЯКІ Я РАСПРАЦАВАЎ. УНІВЕРСАЛЬНЫ АНЦІТАКСІН.
«ЯНЫ АДКАЗВАЮЦЬ, АЛЕ СПАТРЭБІЦЦА ЧАС...»
«ЧАТЫРЫ ДНІ. МАБЫЦЬ, ПЯЦЬ».
ПЯЦЬ ДЗЁН? АМАЛЬ ТЫДЗЕНЬ. У СВЕЦЕ ТЫДЗЕНЬ НЕ БУДЗЕ ЛІГІ СПРАВЯДЛІВАСЦІ... КАЛІ ШТОСЬЦІ ЗДАРЫЦЦА, КАЛІ ЯКІ-НЕБУДЗЬ МАНЬЯК...
ВЕДАЮ, АЛЬФРЭД.
ЁН ПЛАНІРУЕ ШТОСЬЦІ БОЛЬШАЕ. ТАМУ Я І ПАВІНЕН ЯГО ЗЛАВІЦЬ. І ТАМУ ВАМ ТРЭБА БЫЦЬ У НЕЙКІМ БЯСПЕЧНЫМ МЕСЦЫ. ВАМ **АБОДВУМ**.


НЕЙКІМ...
МАЙСТАР БРУС, СПАДЗЯЮСЯ, ВЫ ЖАРТУЕЦЕ.
ТЫ ХВОРЫ, АЛЬФРЭД. І ТЫ ВЕДАЕШ, КАЛІ СПРАВА ТЫЧЫЦЦА ЯГО...
ТОЕ, ШТО ЁН ЗРАБІЎ СА МНОЮ Ў МІНУЛЫ РАЗ...
ВЕДАЮ. ТЫ ЗАРАЗ НЕ Ў ЛЕПШАЙ ФОРМЕ, ТАБЕ ТРЭБА...
НЕ. ГЭТА ПАЧВАРА... КАЛІ ЁН НАПАДЗЕ НА ВАС, ЁН НАПАДЗЕ НА НАС **УСІХ**, НА ЎСЮ ГЭТУЮ СЯМ'Ю.
МАЮ СЯМ'Ю. МЫ ЗМЯНІЛІСЯ З МІНУЛАГА РАЗА. УСЕ МЫ.
І КАЛІ ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ШТО Я БУДУ СЯДЗЕЦЬ І...
KOFF
KOFF
ЦІШЭЙ, ТАТА.
ХОЧАШ, ЗАСТАЦЦА, АЛЬФРЭД?
Я НЕ БУДУ ЗМАГАЦЦА З ТАБОЙ. АЛЕ ХАЦЯ Б АДПАЧНІ.
Я БУДУ Ў ПАРАДКУ, СЭР. А ЦЯПЕР, ПРАШУ ПРАБАЧЭННЯ ЗА МАЮ НЯВЫХАВАНАСЦЬ...
...ІДЗІЦЕ І ЗНАЙДЗІЦЕ ГЭТАГА ЎБЛЮДКА.



*СПЕЦЫЯЛЬНЫ РАЗВЕДВАЛЬНЫ ПОЛК У БРЫТАНСКАЙ АРМІІ.


ЛЯКАРНЯ АРКХЭМ. ПАСЛЯ ЗДАРЭННЯ.
У ДЗІЦЯЧЫМ ШПІТАЛІ НІЯКІХ ЗАЧЭПАК. ТАМУ Я ТУТ.
ВА ЎСІМ ГОТЭМЕ...
...ГЭТАЕ МЕСЦА Я НЕНАВІДЖУ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ.
МАЕ ХАЎРУСНІКІ, ПЭЎНА, ЛІЧАЦЬ, ШТО ГЭТА АЛЕЯ ЗЛАЧЫННАСЦІ.
АЛЕ Я ВЕДАЮ, ШТО ТОЕ МЕСЦА ЗМЯНІЛАСЯ. Я БАЧЫЎ ТАМ ДАБРО.
АЛЕ ГЭТА МЕСЦА. ГЭТЫЯ ДЗВЕРЫ...
КАМЕРА 0801.
ЗВЫЧАЙНА ЯГО ТРЫМАЛІ ТУТ.
ВОСЕМСОТ АДЗІН.
ВАСЬМАЯ І ПЕРШАЯ ЛІТАРЫ АНГЛІЙСКАГА АЛФАВІТА.
СУПАДЗЕННЕ ЦІ ЧЫЙСЬ БАЛЬНЫ ЖАРТ? Я НЕ ВЕДАЮ.
АЛЕ ГЭТА МЕСЦА НІКОЛІ НЕ МЯНЯЕЦЦА.
У МІНУЛЫ РАЗ Я СПАДЗЯВАЎСЯ, ШТО БОЛЬШ НІКОЛІ...
СПАДЗЯВАЎСЯ.


БЭТМЭН?


...ТЫ Ў ПАРАДКУ?
У ПАРАДКУ, **МІСТАР БОРДЭР**.
ВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ У **МАЁНТКУ АРКХЭМ**. НА МАЮ ДУМКУ, ВЯРТАННЕ ДЖОКЕРА РАСХВАЛЯВАЛА ПАЦЫЕНТАЎ.
ГЭТА ТАК.
АЛЕ Я БАЧЫЎ У НАВІНАХ ЦЯБЕ І ГЭТЫХ... «ДЖОКЕРЫЗАВАНЫХ» ГЕРОЯЎ І...
ЗДАЕЦЦА, Я ЧАКАЎ, ШТО ГЭТА ЗДАРЫЦЦА, З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК ПАЧАЎ ПРАЦАВАЦЬ ТУТ*.
*БЫЛО Ў «БЭТМЭН: ШТОГОДНІК» #2.
УСЕ ТАК БАЯЦЦА ЯГО...
МІСТРА БОРДЭР... **ЭРЫК**. Я РАЗУМЕЮ, ТЫ НЕПАКОІШСЯ ЗА ПАЦЫЕНТАЎ. ТЫ ХОЧАШ ІМ **ДАПАМАГЦІ**.
Я **САПРАЎДЫ** ХАЧУ ДАПАМАГЦІ. І Я ЛІЧУ...
ПАСЛУХАЙ. ЁН НЕ ЗВАР'ЯЦЕЛЫ. ЁН ПРОСТА **ЗЛЫ**.
А ЦЯПЕР, КАЛІ ЛАСКА, ВЯРТАЙСЯ Ў МАЁНТАК АРКХЭМ.


СПРАВА Ў ТЫМ, ШТО ТЫ МАЕШ РАЦЫЮ, БЭТМЭН.
КАЛІ Я ЎПЕРШЫНЮ ПАТРАПІЎ У ГОТЭМ, Я ХАЦЕЎ ДАПАМАГЦІ... ГЭТА ЎСЁ, ЧАГО Я ХАЦЕЎ.
Я ХАЦЕЎ ДАПАМАГЦІ ПАЦЫЕНТАМ АРКХЭМА. Я ХАЦЕЎ ДАПАМАГЦІ ГОРАДУ.
І БОЛЬШ ЗА ЎСЁ Я ХАЦЕЎ ДАПАМАГЦІ ТАБЕ.
АЛЕ ПОТЫМ Я ЗРАЗУМЕЎ... ШТО ТАБЕ НЕМАГЧЫМА ДАПАМАГЦІ.
БО ТЫ НЕ БАЧЫШ РУКУ ДАПАМОГІ.
НАВАТ КАЛІ ЯНА ПРАМА ПЕРАД ТВАІМ ТВАРАМ.
ШТО ТЫ С..?
CLANG
ЭРЫК, ШТО ТЫ РОБІШ? ЁН ДАБРАЎСЯ ДА ЦЯБЕ...



ЁН…
…ТЫ САПРАЎДЫ МЯНЕ НЕ **ПАЗНАЕШ**?
ПРЫЗНАЮСЯ, Я І НЕ ДУМАЎ, ШТО ПАЗНАЕШ.
ГЭТА З-ЗА ЦЯГЛІЦАВЫХ РЭЛАКСАНТАЎ, УЗДЗЕЯННЕ ЯКІХ ТОЛЬКІ ШТО СКОНЧЫЛАСЯ. ПРЫЗНАЮСЯ, ЦЯЖКА СТРЫМЛІВАЦЬ ТАКІ ВЫРАЗ **ТВАРУ**…
І ПІГМЕНТАЦЫЯ… ВЕДАЕШ, КОЛЬКІ АФАМЕЛАНАЦІДА І ЎСЯГО ТАКОГА МНЕ ПРЫХОДЗІЛАСЯ ПРЫМАЦЬ? СЁННЯ ТОЛЬКІ МАКІЯЖ, ТАМУ Я І ТРЫМАЎСЯ НА ПЭЎНАЙ АДЛЕГЛАСЦІ ДА ГЭТАХ ХВІЛІНЫ.
І НОВЫ ТВАР, КАНЕШНЕ…
…ХАЦЯ **ІМЯ**…
«ЭРЫК» ПАХОДЗІЦЬ АД ПРОТАСКАНДЫНАЎСКАГА «ЭЙ…», ШТО АЗНАЧАЕ «ВЕЧНЫ», І ГОТСКАГА «РЭЙКС», ШТО ЗНАЧЫЦЬ «ПРЫНЦ».
«БОРДЭР» – ГЭТА АМАФОН АНГЛІЙСКАГА СЛОВА «BOURDER», САСТАРЭЛАГА ВАРЫЯНТА СЛОВА…
«…БЛАЗАН».
БОЖА МОЙ…
ХЕЕЕ…
НЕНЕНЕНЕ…
ТАМУ СКАЖЫ, БЭТСССССССС…
FSSSSSS


...СУМАВАЎ ПА МНЕ?!


ДЖЖЖЖЖООО...
ДЖЖЖ...
...ХАХАХА» ГАЗ ПАЧЫНАЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ? Я ТУТ ПРЫГАТАВАЎ ТРОХІ ПАРАЛІЗУЮЧАГА. Я ВЕДАЮ, ШТО ТЫ ВЫПРАЦАВАЎ ІМУНІТЭТ ДА ШМАТ ЧАГО, ТАМУ ГЭТА НЕШТА НЕЗВЫЧАЙНАЕ!
ГЭТА ПЕРШАЯ ЧАСТКА КОМБА, А ЦЯПЕР **ДРУГАЯ**!
ТЫЫЫЫЫ...
О ТАК, ГЭТА САПРАЎДЫ Я, БЭТС.
Я ВЯРНУЎСЯ, КАБ ПАБАЧЫЦЦА З ТАБОЙ У АПОШНІ РАЗ...
...ЦІ БАЧЫШ, РАНЕЙ... УСЯ ГЭТА ГУЛЬНЯ, ЯКУЮ Я ЗЛАДЗІЎ ДЛЯ ЦЯБЕ, ПРАВОДЗІЛАСЯ З ПАЧУЦЦЁМ КЛОПАТУ... У ЯЕ ПАВІНЕН БЫЎ БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫ КАНЕЦ! ГЭТА БЫЛА **КАМЕДЫЯ**!
АЛЕ ТЫ МЯНЕ СКІНУЎ СА СКАЛЫ. ХАХА!
ТАМУ...
БАЮСЯ, НА ГЭТЫ РАЗ...
...О-ОУ. ХІХІХІ...



ТЫ НЯ ЗМОЖАШ РУХАЦЦА, КАЛІ ЎСЁ ПАЧНЕЦЦА.
ТЫ БУДЗЕШ УСЁ АДЧУВАЦЬ, КАНЕШНА ЖА. ПА-ПЕРШАЕ, ІНФЕКЦЫЯ...
...ПА-ДРУГОЕ І ПА-ТРЭЦЯЕ...
...ВЕЧАРЫНА НАБІРАЕ ХАДУ...
...ТЫ ЎБАЧЫШ, ЯК УСЁ АДБУДЗЕЦ-ЦА, АЛЕ, БАЮСЯ, НЕ ЗМОЖАШ ЗУСІМ НІЧОГА ЗРАБІЦЬ!



ГУЧЫЦЬ КАЗАЧНА, ТАК?!
ВЕДАЕШ ШТО, БЭТСССС, У ГЭТЫ РАЗ НІЯКІХ ГУЛЬНЯЎ... НІЯКІХ ЖАРТАЎ. Я СПЫНЮ ГЭТУЮ ДАРЭМШЧЫНУ!
РАНЕЙ Я ЛІЧЫЎ, ШТО НАМ З ТАБОЙ МАГЛО Б БЫЦЬ ВЕСЕЛА, АЛЕ НЕ... МНЕ СТАЛА СУМНА З ТАБОЙ. ЛІЧУ, Я ПРОСТА ЦЯПЕР ВЕДАЮ ЦЯБЕ ЗАНАДТА ДОБРА.
АЛЕ ВОСЬ ШТО ПАЦЕШНА... Я? ТЫ Ж НІЧОГА ПРА МЯНЕ НЕ ВЕДАЕШ, САПРАЎДЫ? Я ТАБЕ ЎСЁ ЯЧШЭ АБСА-ЛЮТНА НЕЗНАЁМЫ.
МОЖАШ РАБІЦЬ ВЫГЛЯД, БЫЦЦАМ ВЕДАЕШ МЯНЕ, АЛЕ Ў ГЛЫБІНІ... О, ТЫ І САМ УСЁ ЎБАЧЫШ... ДАВОЛІ ХУТКА ТЫ І САМ УСЁ ПАБАЧЫШ... ХЕХЕ.
ННЕ.
ТАК. ЧАС ПЕРАРЭЗАЦЬ КАЗЛУ ГЛОТКУ, «СССТАРЫНА».
І ВОСЬ, ШТО Я АБЯЦАЮ ТАБЕ...


...КАЛІ ТЫ ВЫБЕРАШСЯ З ГЭТАГА, УСЁ Ў ГОТЭМЕ, УВЕЕЕ-ЕСЬ ГОРАД...
BANG
...БУДЗЕ СМЯЯЦЦА З ЦЯБЕ.
BLAM
TO BE CONTINUED ?!!!


«ПРОСТА ДЗІЎНА, ЯК СМЕХ АДБІВАЕЦЦА Ў РЭХА. НА АДЛЕГЛАСЦІ ЎСЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ЗНІКАЕ. ГЭТА ПРОСТА ШУМ...»
"SAVED"
*«УРАТАВАНЫЯ»
Written by JAMES TYNION IV
Art by GRAHAM NOLAN
Colors by GREGORY WRIGHT
Letters by TAYLOR ESPOSITO
ВЯЛІКАЯ СЦЯНА КІТАЙСКІ РЭСТАРАН
«ГЭТЫЯ ВЫСОКА ЧАШЧЫННЫЯ ІМПУЛЬСЫ ГУКА. АСОБНА АД ЧАЛАВЕКА. НА ТАКОЙ АДЛЕГЛАСЦІ ЯНЫ ПЕРАСТАЮЦЬ ПРЫЕМНА ГУЧАЦЬ... ПЕРАСТАЮЦЬ БЫЦЬ **ВЯСЁЛЫМІ**...»
...ВОСЬ, ЁН СТАНОВІЦЦА ПАДОБНЫМ НА КРЫК.
МІЛАЯ, ЧАСТКА ГЭТАГА ШУМА І **ЁСЦЬ** КРЫК.
ОЎ.
К-КАЛІ ЛАСКА... ВЫ **ЎРАЧ**? ВАШ ХАЛАТ... ПА ЯМУ ВІДАЦЬ, ШТО ВЫ З **АРКХЭМА**.
МЯНЕ ЎКУСІЛІ. АДЗІН З ІХ УКУСІЎ МЯНЕ...
ПРАБАЧЦЕ... Я НЕ МАГУ... Я НЕ МАГУ ПАМАГЦІ... МНЕ НЕ ДАЗВОЛЯЦЬ.
ХТО ЎКУСІЎ ВАС?
АДЗІН З **ІХ**. АДЗІН З ТЫХ, ХТО НА ВУЛІЦЫ. ЯНЫ... ЯНЫ СМЯЯЛІСЯ. УСМІХАЛІСЯ.
ЁН ВЯРНУЎСЯ, ТАК? **ДЖОКЕР**...
...ЗДАЕЦЦА, ЁН **ХВОРЫ**.
НЕ! НАС НЕЛЬГА ЗАРАДЖАЦЬ. НЕ, НЕ, НЕ...
...МЫ НА ЗАДАННІ!


ПРАКЛЯЦЦЕ, МОРТАН! ІМ ТРЭБА ДЫХАЦЬ!
ХІ! ХІ!
ОЙ! ОЙ, ПРАБАЧЦЕ! ПРАБАЧЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!
УСЁ Ў ПАРАДКУ.
МЫ Ў ГОРАДЗЕ, ЭФРАМ. ЯК ТЫ І ХАЦЕЎ. НАВОШТА МЫ ТУТ? Я ЛІЧЫЛА, МЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ШУКАЦЬ ШТОСЬЦІ.
ЯШЧЭ НЕ. ТАМ УСЁ ЯШЧЭ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА. ЯК ЁН І СКАЗАЎ.
ГОРАД... ЁН СМЯЕЦЦА... СТАНОВІЦЦА ШЧАСЛІВЫМ...
...АЛЕ ЁН ЯШЧЭ НЯ ШЧАСЛІВЫ. ЯШЧЭ НЕ.
ХУТКА.
ЦЯПЕР... ЦЯПЕР МАЯ ЧАРГА...
М?
ВОСЬ, НА ЯГО РУКЕ... ГЭТА ЁН. ЗНАК.
ЧЫП. ЧЫП, ЯКІ Я БАЧЫЛА.
О БОЖА... О БОЖА, О БОЖА, О БОЖА.
ЁН АДЗІН З ІХ!
ВЫ ЎСЕ ЯК ЯНЫ!
УСЁ Ў ПАРАДКУ, МІЛАЯ. ПРОСТА РАСКАЖЫ СВАЮ ГІСТОРЫЮ. ЯК ЁН І ХАЦЕЎ.


УСЁ БЫЛО ТАК **ДОБРА**, ПАКУЛЬ ЯНЫ НЕ ЗМЯНІЛІСЯ.
У НАС БЫЎ МІЛЫ ДОМІК ЗА ГОРАДАМ. **ААРАН**, МОЙ МУЖ, БЫЎ БАНКІРАМ. КОЖНУЮ РАНІЦУ ЦЯГНІКОМ ЕЗДЗІЎ НА ПРАЦУ.
Я ЎСЁ ЯШЧЭ ПАМЯТАЮ ЯГО ЎСМЕШКУ. **УСМЕШКУ**, З-ЗА ЯКОЙ Я **ПАКАХАЛА** ЯГО.
«У НАС БЫЛО ТРЫ ДЗІЦЯЦІ. ЯНЫ БЫЛІ ТАКІМІ РАЗУМНЫМІ І ВЯСЁЛЫМІ. СУМНЯВАЮСЯ, ШТО Я БЫЛА ТАКОЙ ЖА РАЗУМНАЙ».
«УСЁ БЫЛО **ВЫДАТНА**. ГЭТА ЎСЁ, ЧАГО Я ЖАДАЛА».
«АЛЕ АДНОЙЧЫ ЁН ПРЫЙШОЎ ДАДОМУ... **ІНШЫМ**. ГЭТА ЦЯЖКА АПІСАЦЬ, АЛЕ Я **ВЕДАЛА**. Я ЎБАЧЫЛА ЯГО ТВАР І ЗРАЗУМЕЛА, ГЭТА ЎЖО НЕ ЁН».
«Я ВЕДАЛА, ШТО ГЭТА ХТОСЬЦІ ІНШЫ».
«**ШТОСЬЦІ** ІНШАЕ».
«СПАЧАТКУ Я ЗАСТАЛАСЯ Ў СВАІМ ПАКОІ. Я НЕ ХАЦЕЛА, КАБ ЁН ВЕДАЎ, ШТО Я ЗРАЗУМЕЛА...»
«...ШТО Я ЧУЛА, ЯК ЯГО ТЭЛЕФОНЧЫК ЗВАНІЦЬ ЯГО ГАСПАДАРАМ. ШТО Я **ВЕДАЛА** ПРА ІХ ЗАДУМКІ».


«І Я ЧУЛА ЯГО І ДЗЯЦЕЙ УНІЗЕ. ЯНЫ **СМЯЯЛІСЯ**. ЯНЫ СМЯЯЛІСЯ ТАК МОЦНА, ШТО Я **ЗАПЛАКАЛА**».
«І Я **ВЕДАЛА**, ШТО АДБЫВАЛАСЯ. ЁН РАБІЎ ІХ ПАДОБНЫМІ НА СЯБЕ. ЁН УСТАЎЛЯЎ У ІХ **МАШЫНЫ**».
«ЯНЫ СМЯЯЛІСЯ, БО ІМ ТРЭБА БЫЛО ПАЗБАВІЦЦА АД УСІХ ЭМОЦЫЙ. КАБ ЯНЫ ЗМАГЛІ **ПЕРАСТАЦЬ** БЫЦЬ ЛЮДЗЬМІ. КАБ ЯНЫ ЗМАГЛІ ЦАЛКАМ СТАЦЬ МАШЫНАМІ».
«Я БАЧЫЛА ІХ МАЛЕНЬКІЯ КАМПУТАРЫ, ПАДКЛЮЧАНЫЯ ДА ІХ. Я БАЧЫЛА, ЯК ЯНЫ ГУБЛЯЛІ СЯБЕ... І КАЛІ ЁН ВЯРНУЎСЯ ДАДОМУ НОЧЧУ, А Я СХАВАЛАСЯ, ЯНЫ ПРОСТА СМЯЯЛІСЯ, СМЯЯЛІСЯ І **СМЯЯЛІСЯ**».
«Я ВЕДАЛА, ШТО ЯНЫ ЗГУБЛЕНЫЯ, І Я ПАВІННА БЫЛА **ВЫЗВАЛІЦЬ** ІХ...»
«ГЭТА БЫЛО ДЗІЎНА... ТЭХНАЛОГІЯ БЫЛА ТАКОЙ ПРАСУНУТАЙ, ШТО НЕ БЫЛА ПАДОБНА НА ТЭХНІКУ. ЯНА БЫЛА ПАДОБНА ПРОСТА НА КРОЎ І ЦЕЛА...»
«АЛЕ Я РЭЗАЛА ГЛЫБЕЙ І ГЛЫБЕЙ, І ЗНАЙШЛА ЯГО Ў ІХ МАЗГАХ».
«ЧЫП. ЧЫП, ЯКІ ЯНЫ ЎСТАВІЛІ. ЯКІ ІХ **ЗМЯНІЎ**».


«ДАКТАРЫ СКАЗАЛІ МНЕ, ШТО НЕ БЫЛО НІЯКАГА ЧЫПА. АЛЕ ГЭТА БЫЛО НЯПРАЎДА. ГЭТА ТОЛЬКІ ЎСЁ ПАЦВЯРДЖАЛА. УСЕ ЯНЫ БЫЛІ ЧАСТКАЙ СІСТЭМЫ. МЯНЕ ЗЫЧЫНІЛІ, КАБ Я НІКОМУ НІЧОГА НЕ РАСКАЗАЛА».
«ВЫ ВЕДАЕЦЕ. ВЫ ВЕДАЕЦЕ ЎСЁ ГЭТА. ВЫ **АДНІ** З ІХ. ВЫ ЎСЕ, МАГЧЫМА, ІНАЧ ВЫ Б БАЧЫЛІ...»
«...ЁН МЯНЕ ПАПЯРЭДЖВАЎ».
КАРДЭЭЭЛІЯ... МАЯ САЛОДКАЯ КАРДЭЛІЯ...
ТЫ МЕНАВІТА ТАКАЯ, ЯК ЁН ЦЯБЕ АПІСАЎ. ТАКАЯ Ж ПРЫГОЖАЯ.
ТВОЙ ДАРАГІ ААРАН, КАЛІ Я **АДНЯЎ** ЯГО Ў ЦЯБЕ, ЁН ПЛАКАЎ, І ЁН УСЁЁЁЁ МНЕ ПРА ЦЯБЕ РАСКАЗАЎ.
ХТО?...
ТЫ... ТЫ...
САПРАЎДЫ. Я РАБІЎ ГЭТА ГАДАМІ... ПРЫХОДЗІЎ У ВАШЫ ДАМЫ, БРАЎ ВАШЫХ ДЗЯЦЕЙ, ВАШЫХ МУЖОЎ...


РАБІЎ ІХ ЛЕПШ...
РАБІЎ ІХ ТАКІМІ Ж, ЯК Я.
ЛЮДЗІ ТАКІЯ СЛАБЫЯ... І ЯНЫ НЕ **РАЗУМЕЮЦЬ**. ЯНЫ МЯНЕ ЗАБІВАЮЦЬ ЗНОЎ І ЗНОЎ, АЛЕ ПАДОБНАЕ МНЕ НЕМАГЧЫМА ЗАБІЦЬ.
МНЕ ТОЛЬКІ ТРЭБА САБРАЦЬ НОВАЕ ЦЕЛА... У МЯНЕ ІХ ТЫСЯЧЫ... І З КОЖНЫМ ДНЁМ УСЁ БОЛЬШ.
МОЖАШ ДУМАЦЬ, ШТО Я ЖОРСТКІ, АЛЕ ТАК ЛЕПШ... Я МАГУ САБРАЦЬ ЦЯБЕ ЗНОЎ І ЗРАБІЦЬ **ЛЕПШ**.
Я МАГУ САБРАЦЬ НОВЫЯ КОПІІ ААРАНА І ДЗЯЦЕЙ... УВЕСЬ НАБОР.
ДАЙ МНЕ ЎРАТАВАЦЬ ЦЯБЕ, ЯК Я ЎРАТАВАЎ ІХ. ЯК Я **ЎРАТАВАЎ** МНОГІХ.
ТРЭБА ТОЛЬКІ, КАБ ТЫ СЛУХАЛА... Я МНОГА ТАБЕ РАСКАЖУ. ТЫ МНОГАЕ ПАВІННА **ЗРАБІЦЬ** ДЛЯ МЯНЕ.


О БОЖА, ЁН ГРАЕ НА ВАШЫХ **ФАНТАЗІЯХ**... НЯЎЖО ВЫ НЕ РАЗУМЕЕЦЕ? ЁН ТОЛЬКІ ГАВОРЫЦЬ ТОЕ, ШТО ВЫ ХОЧАЦЕ ПАЧУЦЬ!
НЕ! ЁН АДКРЫВАЕ НАМ **ІСЦІНУ**! ЁН ПАКАЗВАЕ НАМ, ЯК УСЁ БЫЛО НА САМОЙ СПРАВЕ. ПА МЕНШАЙ МЕРЫ, ПАКАЗАЎ МНЕ.
ПАКАЗАЎ... АДНАМУ З НАС...
ЛЮДЗІ... ЯНЫ РУХАЮЦЦА...
РУХАЮЦЦА, РУХАЮЦЦА...
...ХІ.
БОЛЬШ ШУМУ... ШУМ ЗВОНКУ. ДРЭННЫ ШУМ.
ЧУЕЦЕ МЯНЕ? ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?


ХАХ!
HAHAHAHAHA
ЁН… ЁН УРАТАВАЎ ІХ…
…І ЦЯПЕР ЁН УРАТУЕ НАС УСІХ!
TO BE CONTINUED